Ганна Басава

Некаторыя аспекты невербальнай камунікацыі ў міжкультурных зносінах

Праблемы ўзаемаадносін моўных і сацыяльных структур цесна ўзаемазвязаны з антрапацэнтрычнай парадыгмай у лінгвістыцы, якая вывучае мову ў цеснай сувязі з чалавекам, яго свядомасцю, духоўна-практычнай дзейнасцю. У межах уласнай культуры фарміруецца ілюзія свайго бачання свету, вобраза і спосабу жыцця як адзіна магчымага і, галоўнае, адзіна прымальнага. Толькі ў тым выпадку, калі чалавек выходзіць за межы сваёй культуры, г.зн. сутыкнуўшыся з іншым светабачаннем і светаўспрыманнем, ён можа зразумець спецыфіку сваёй уласнай грамадскай свядомасці, “убачыць” адрозненне ці канфлікт культур.

Працэсы глабалізацыі ў свеце праектуюцца на сістэму моўнай адукацыі ў плане міжкультурных кантактаў. У прыватнасці, назіраецца арыентацыя на геапалітычныя мэты ў межах еўрапейскай агульнасці (вылучэнне агульных каштоўнасцей, мэт, адукацыйных стандартаў, сацыякультурных партрэтаў спецыялістаў). Міжкультурнае навучанне прадугледжвае фарміраванне асобасных якасцей навучэнцаў і іх здольнасцей да ўсвядомленага, адэкватнага ўзаемадзеяння ў сацыяльна-дэтэрмінаваных сітуацыях (здольнасць зразумець іншыя лінгвакультурныя каштоўнасці, іншы вобраз моўнай свядомасці). Так, С.Сторці вылучае чатыры асноўныя моманты, карысныя ў навучанні міжкультурным зносінам:

1. фарміраванне адаптыўных паводзін;
2. выкарыстанне рашэння праблем;
3. знаёмства з канкрэтнымі носьбітамі замежнай мовы з мэтай усведамлення іх культуры;
4. больш глыбокае і ўсебаковае вывучэнне ўласнай культуры для таго, каб зразумець іншакультуру.

Звычайна іншамоўны матэрыял у працэсе навучання падаецца з пазіцыі інсайдара (жыхара краіны) і аўтсайдара (жыхара іншай краіны), што дазваляе вылучыць наступныя асаблівасці рэалізацыі навучальнага матэрыялу ў аспекце міжкультурнай камунікацыі:

1. супастаўленне іншамоўнага матэрыялу праз прызму інсайдара і аўтсайдара і выяўленне агульных і адрозных прафесійна-значымых уменняў і кантэкстаў прафесійнай дзейнасці;
2. выбар адпаведных тэхналогій навучання на падставе камунікатыўна-прагматычнага і кагнітыўнага падыходаў, якія адпавядаюць характару прафесійнай дзейнасці іншакамунікантаў;
3. распрацоўка інфраструктуры курса ў адпаведнасці з заканамернасцямі пазнаваўчай дзейнасці навучэнца і падбор навучальных матэрыялаў і заданняў з улікам таго, што яны павінны ўзбагачаць прафесійны вопыт навучэнца ў абранай галіне ведаў.

Як адзначае С.Сторці, “мы гаворым аб далучэнні да культуры, але ў сапраўднасці, мы далучаемся не да культуры, а да паводзін. Культура, сістэма вераванняў і каштоўнасцей, якая падзяляецца пэўнай групай людзей, з’яўляецца абстракцыяй, якая можа быць ацэнена інтэлектуальна, але на самой справе менавіта паводзіны мы адчуваем як найбольш асноўнае праяўленне культуры”.

На нашу думку, прыклад Беларусі і Германіі ўяўляецца даволі ўдалым для назіранняў: гэта дзве дзяржавы, якія адпаведна належаць да ўсходнеславянскага і рамана-германскага свету, размешчаны на захадзе і ўсходзе Еўропы, і сёння, на пачатку III тысячагоддзя, дэманструюць даволі актыўныя кантакты як на эканамічным, так і на культурным узроўнях. Гісторыя краіны, а карыстаючыся семіятычнай тэрміналогіяй, “тэкст” яе шматвяковага быцця, з часоў Гегеля і В.фон Гумбальта, дазваляе разглядзець у ёй непаўторную нацыянальную “душу”. Душа народа, яго этнапсіхалогія, якія фарміруюцца натуральна-геаграфічнымі ўмовамі і нацыянальнай гісторыяй, у беларусаў і немцаў выяўляюць як пэўныя супадзенні, так і

істотныя адрозненні, што, нягледзячы на аддаленасць дзвюх краін, часам як спрашчае, так і ўскладняе міжкультурную камунікацыю.

Абавязковай умовай пры вывучэнні іншай мовы і яе культуры з'яўляецца вывучэнне як вербальных, так невербальных сродкаў камунікацыі, г.зн "мовы ў плыні маўлення" і "мовы ў дзеянні", што садзейнічае рашэнню задачы, як у зносінах забяспечыць перадачу інфармацыі ў змесце і форме, характэрнай для натуральнай выразнай мовы яе носьбітаў. Значэнне і сэнс вербальнага паведамлення істотна залежаць ад невербальнага кантэксту, фонавых ведаў, сацыяльнага статусу ўдзельнікаў маўленчага акта і нават ад іх фізічнага стану, узросту, знешнасці, настрою і г.д. Таму знаёмства з правіламі невербальных зносін адбываецца ўжо на пачатковым этапе навучання іншакамуніканта, калі вывучаюцца стандартныя формы зносін, вітання, развітання, прабачэння і г.д.

Разам з тым невербальны аспект неабходна разглядаць больш шырока і не зводзіць яго толькі да "мовы жэстаў". Таму для дасягнення адэкватных зносін неабходна не толькі веданне мовы, але і ўяўленне аб невербальным аспекце камунікатыўнай сістэмы культуры, мова якой вывучаецца, а паколькі вусны і невербальны складнікі камунікатыўнай сістэмы ўзаемазвязаны, іх неабходна засвойваць адначасова.

Так, напрыклад, ва ўжыванні сімвалічных кінем у беларускіх і нямецкіх камунікатыўных паводзінах можна вылучыць:

1. супадзенні ў выкананні кінем і іх сэнсаў;
2. разыходжанні ў выкананні кінем пры супадаючых сэнсах;
3. разыходжанні ў сэнсах кінем пры супадзенні іх выканання;
4. наяўнасць у камунікатыўных паводзінах носьбітаў вывучаемай мовы і культуры кінем, якія адсутнічаюць у роднай мове іншакамуніканта.

Да кінем першай групы, якія супадаюць у выкананні і сэнсах, адносяцца шматлікія кампаненты асноўных тыпаў камунікатыўных сітуацый, такіх як вітанне, развітанне, знаёмства, станоўчая і адмоўная рэакцыя, удзячнасць, здзіўленне, радасць, прыемная нечаканасць, суцяшэнне.

Да другой групы кінем, якія супадаюць паводле значэння, але адрозніваюцца ў выкананні, адносяцца жэсты прывітання і развітання ў час, калі камуніканты знаходзяцца на адлегласці. У носьбітаў нямецкай мовы рука сагнутая ў локці, кісць робіць лёгкія рухі з боку ў бок ці той жа рух робіцца выцягнутай рукой. У носьбіта беларускай мовы прыпаднятая рука рухаецца (памахвае) уперад-назад.

Каб прыцягнуць увагу ў час сходу падымаюць руку. Пры гэтым у нямецкай аўдыторыі далонь накіравана наперад, у беларускай – павернута рабром наперад. Ці, напрыклад, пры лічэнні на пальцах у нямецкім жэсце сагнутыя пальцы на левай руцэ, і, пачынаючы з вялікага пальца, разгінаюць пальцамі правай рукі, складзеныя разам пальцы левай рукі; у адпаведным беларускім жэсце пальцы згінаюць, пачынаючы з мезенага. Адзначаюцца і адрозненні ў выкананні адмоўных жэстаў. Напрыклад, “пагроза пальцам” mit dem Zeigefinger drohen – рука, сагнутая ў локці, звернута далонню да гаворачага, указальны палец выцягнуты, астатнія складзены, кісць рукі робіць кароткія рухі злева направа. Пры выкананні беларускага жэста далонь звернута да гаворачага, кісць рукі рухаецца наперад-назад.

Да кінем, якія разыходзяцца ў сэнсах, але супадаюць у выкананні, адносіцца, напрыклад, mit Handschlag, які ў нямецкай традыцыі звязаны з сітуацыямі прывітання і развітання (begrüßen, sich verabschieden). У той час, як у беларускай традыцыі біць\ударыць па руках мае значэнне “заключыць дамову\дамовіцца”.

Жэст mit den Fingern schnalzen у нямецкай традыцыі выкарыстоўваецца з мэтай прыцягнення ўвагі (напрыклад, нецярплівым вучнем настаўніка ў школе, наведвальнікам афіцыянта ў рэстаране), у беларускай традыцыі значэнне гэтага жэста як выражэнне радасці, так і няўдачы, памылкі. Паднятая рука з выцягнутым уверх указальным пальцам den Zeigefinger heben – жэст вучня ў нямецкай школе з мэтай прыцягнуць увагу настаўніка. У беларускай традыцыі гэта падкрэсліванне самага галоўнага ў размове.

Да кінем, якія адсутнічаюць у камунікатыўных паводзінах носьбітаў беларускай мовы, адносіцца, напрыклад, жэст “стукаць сагнутымі пальцамі па стале” mit den Fingerknöcheln auf die Tischplatte klopfen. Так традыцыйна нямецкія студэнты віталі выкладчыкаў ва універсітэтах. Зараз гэты жэст пашырае сферу свайго выкарыстання і ўжываецца ў нямецкіх вышэйшых школах пасля ўдалага даклада, лекцыі, паведамлення як выкладчыка, так і студэнта, а таксама як знак падзякі на заключнай лекцыі выкладчыка. Ці, напрыклад, “тупаць нагамі” mit den Füßen trampeln – выражэнне станоўчай ацэнкі і “шоргаць нагамі” mit den Füßen scharren – выражэнне адмоўнай ацэнкі.

У беларускай традыцыі ёсць падобныя кінемы, аднак зусім з іншым значэннем; параўн. “пастукаць сагнутай рукой па стале” - заклік захоўваць цішыню; “тупаць нагамі”- выражэнне пагрозы, абурэння; “падняць палец”- падкрэсліць самае галоўнае. Падобныя разыходжанні ў кінемах часам могуць прывесці да няправільнага разумення ці тлумачэння камунікатыўных паводзін іншафона і стаць прычынай канфлікту культур ці “культурнага шоку”.

Як бачым, асаблівае значэнне ў камунікатыўных паводзінах, як і ў цэлым у гісторыі камунікатыўных паводзін, мае рука. Параўноўваючы далей беларускія жэсты з жэстамі еўрапейскімі, адзначым, што беларусы не карыстаюцца сінхроннымі рухамі абедзвюх рук. Жэстыкуляцыя ажыццяўляецца адной правай рукой, другая рука ці зусім не жэстыкулюе, ці жэстыкулюе ў меншай ступені і не паўтарае рухаў правай. Перавага правай рукі замацавалася ў свядомасці і мове, г.зн. у культурнай традыцыі; напрыклад, у славян правая рука – лепшая, больш важная; параўн. правы – гэта правільны, левы заробак – гэта незаконны заробак, што дрэнна. Правае традыцыйна звязвалася з правільным, устойлівым, прамым і асацыіруецца з праўдай, у той час як левае з падманам. У цэлым апазіцыя “ правае-левае” – адна з найважнейшых міфалагічных, моўных, фальклорных і ментальных апазіцый для беларусаў. Таму традыцыйна пачынаць любую справу (есці,

апранацца) неабходна правай рукой. Пачынаць рухацца, пераступаць праз ганак таксама неабходна з правай нагі і г. д. Спецыялісты па зносінах звяртаюць увагу на тое, што ў любой культуры жэсты няшчырасці звязаны, як правіла, з левай рукой, у той час як правая рука “акультурана”: яна робіць тое, што трэба, а левая – тое, што хоча, выяўляючы пры гэтым тайныя пачуцці ўладальніка.

Поціск рукі – адзін з найбольш распаўсюджаных жэстаў, які выкарыстоўваецца пры сустрэчы, знаёмстве, развітанні, заключэнні пагаднення. Асабліва гэты жэст распаўсюджаны ў Еўропе. Прычым і вітаюцца, і развітваюцца паціскаючы руку як мужчынам, так і жанчынам, што не ўласціва беларускай культуры паводзін. Безадносна да таго, ці гэта мужчына, ці жанчына, ці абедзве жанчыны, ці абодва мужчыны як пры афіцыйных, так і пры нейтральных зносінах на Захадзе вітаюцца і развітваюцца за руку, што падкрэслівае раўнапраўныя, партнёрскія адносіны паміж мужчынамі і жанчынамі.

У культурах многіх народаў поціск рукі ў якасці знаку прывітання доўгі час не быў штодзённым і выкарыстоўваўся толькі ў асабліва ўрачыстых выпадках. Так, характар рытуалу меў поціск рукі ў дыпламатычнай практыцы. Пры двары маскоўскага цара ў XYI – XYII стагоддзях поціск рукі прымяняўся выключна пры зносінах з еўрапейскімі пасламі. У цэлым, беларускія жэсты вызначаюцца сітуацыяй, адносінамі гаворачых і іх сацыяльнай прыналежнасцю. Чым чалавек больш выхаваны і ветлівы, тым больш стрыманыя яго жэсты.

Такім чынам, у навучанні невербальным зносінам выяўляецца як адрозненне, так і падабенства ў сацыякультурным успрыманні свету рознымі народамі. І невербальныя паводзіны, якія характарызуюцца камунікатыўнасцю і нацыянальнай абумоўленасцю, павінны ўлічвацца ў міжперсанальных і ў міжкультурных зносінах.

ЛІТАРАТУРА

1. Иванов В. В., Гамкрелидзе Т. В. Индоевропейский язык и индоевропейцы. Т. 2 // В. В. В. Иванов, Т. В. Гамкрелидзе. - Тбилиси. 1984. С. 785.
2. Грушевицкая Т. Г., Попков В. Д., Садохин А. П. Основы межкультурной коммуникации // Т. Г. Грушевицкая, В. Д. Попков, А. П. Садохин.. - М., 2003.
3. Леонтьев А. А. Основы психолингвистики // А. А. Леонтьев. - М. 1997.
4. Пронников В. А., Ладанов И. Д. Язык мимики и жестов // В. А. Пронников, И. Д. Ладанов. - М., 1998.
5. Storti C. The Art of Crossing Cultures. – 1989. – Yarmouth, Maine, 1989.